

Сорт «зоя касмадзем'янская»

# І ЗНОЎ РАСЦВІТАЕ БЭЗ 1945-га...

Александрына ПАРШЫНА

Фота Наталлі ХАМІЦЭВІЧ, з архіва Кацярыны ВАВІЛАВАЙ

**Ці чулі вы, што бэз часам называюць кветкай Перамогі, надзеі і гераізму? На Салігоршчыне гэта ведаюць дакладна. Амаль 5 гадоў тут дзейнічае сацыяльная эстафета, ініцыяваная Салігорскай цэнтральнай бібліятэкай і падхопленая ўстановамі адукацыі раёна – «І зноў расцвітае бэз 45 года». Напярэдадні Дня Перамогі да яе падключылася Харастоўская сярэдняя школа. Але аб усім па парадку.**

Эстафета «І зноў расцвітае бэз 45 года», як згадвае яе заснавальніца, бібліятэкар **Кацярына ВАВІЛАВА**, вырасла з патрыятычнай міжнароднай акцыі «Бэз Перамогі», накіраванай на пасадку гэтых прыгожых духмяных кветак. За паэтычнай назвай сапраўдны гістарычны факт: з букетамі бэзу шчаслівыя савецкія людзі сустракалі з фронту сваіх блізкіх. З тых часоў гэтая кветка – сімвал гераізму і надзеі. У 2014 годзе клуб кветкаводаў «Флора», які ўзначальвае Кацярына Вавілава, прапанаваў навучэнцам Салігорскага дзяржаўнага каледжа далучыцца да незвычайнай ініцыятывы. Моладзі так спадабалася, што ў іх амаль адразу з'явілася некалькі тэматычных сартоў: «маршал жукаў», «паліна асіпенка», «вялікая перамога», «неба масквы» і інш. Вывеў і прысвяціў іх героям Вялікай Айчыннай вайны знакаміты селекцыянер-самавучка, франтавік Леанід Калеснікаў.



У маі 2020 года бібліятэка прапанавала каледжуаднавіць прыгожую традыцыю. Эстафета атрымала назву, трапіла ў сярэднія школы ў Старобіне, Салігорску і... разышлася па астатніх установах адукацыі рэгіёна. Незвычайная падача патрыятычнага матэрыялу і экалагічны складнік – магчымасць унесці ўклад у азеляненне родных вуліц – толькі спрыялі яе папулярнасці. Сёлета да праекта далучылася Харастоўская сярэдняя школа (Салігорскі раён).

Па словах бібліятэкара, чым больш часу праходзіць з моманту заканчэння вайны, тым больш яна здаецца моладзі тэкстам на старонках падручнікаў. Але Вавілава спадзяецца, што праз «бэзавую» гісторыю, лекцыі пра Леаніда

> Ва ўрочышчы Векерава з другой паловы 1943 года дзейнічаў партызанскі аэрадром, які меў вялікае стратэгічнае значэнне для Палескага краю, бо з'яўляўся адзінай сувяззю паміж глыбокім тылам і Вялікай зямлёй. Дзякуючы яму падвозіліся баепрыпасы, медыкаменты, ежа і іншыя каштоўныя грузы.

Калеснікава і працу ўсяго яго жыцця маладое пакаленне можа ўбачыць вайну з іншага ракурсу. Зразумець, што гэта жывая памяць, бо бэзавы куст жыве 100 гадоў, і столькі ж будуць хадзіць пад яго кветкамі – духмянымі аблокамі – нашчадкі, успамінаючы герояў, што падаравалі ім мірнае неба.

Дарэчы, ва ўрочышчы Векерава навучэнцы Харастоўскай сярэдняй школы разам з прадстаўнікамі Салігорскага райвыканкама, Салігорскай раённай цэнтральнай бібліятэкі, Старобінскага лясгаса і Харастоўскага лясніцтва пасадзілі «каржовы» бэз. Сорт абраны невыпадкова: вёска Харастова – малая радзіма легендарнага партызанскага камбрыга, Героя Савецкага Саюза Васіля Каржа. Цікавы біяграфічны факт: пасля вайны ён працаваў намеснікам міністра лясной гаспадаркі БССР, а потым старшынёй мясцовага калгаса.

– Калісьці даўным-даўно з камандзіроўкі Васіль Захаравіч прывёз незвычайнай прыгажосці бэз, – расказвае Кацярына Вавілава. – З часам куст пасяліўся ў кветніках, а ў народзе яго сталі зваць «каржовы». І такой можа быць гістарычная памяць – памайску сонечнай, пранізанай водарам бэзу. Памяць пра чалавека, які не толькі любіў і абараняў сваю Радзіму, але і ўпрыгожваў яе.

– Мы ганарымся, што такія людзі, як Васіль Захаравіч, узначальвалі лясную гаспадарку, – дадаў прадстаўнік Старобінскага лясгаса **Аляксандр ПАШКЕВІЧ**. – Ганарымся, што працягваем яго справу, перадаючы свае веды будучаму пакаленню. ■

Сорт «каржовы» бэз



Дзякуючы намаганням бібліятэкараў, «каржовы» бэз пасаджаны ў Старобіне, Салігорску, Мінску. Літаральна некалькі тыдняў таму да іх далучыўся і Пінск, дзе кветка-прыгажуня з'явілася каля мемарыяльнага знака Васілю Каржу на Паляне партызанскай славы.

## Віктарына «Чатырохногія байцы»

Вялікая Айчынная вайна пакінула незабыўны след у гісторыі нашай краіны. У гэты страшны час разам з нашымі прадзедамі адважна ваявалі і жывёлы. Яны выратавалі тысячы чалавечых жыццяў і дапамаглі наблізіць Дзень Перамогі. Давай праверым, наколькі добра ты ведаеш пра іх.

1. Якія жывёлы беспамылкова папярэджвалі людзей аб авіяналётах і газавых нападах?
2. Навошта ў 1943 годзе ў вызвалены Ленінград завезлі цэлую «дывізію» катоў з Яраслаўля і Цюмені?
3. Якіх моцных лясных жывёл часам прыручалі партызаны, каб выкарыстоўваць іх у якасці цяглавай сілы?
4. Што такое «голубаграма»?
5. Як выкарыстоўвалі ў гады ваеннага ліхалецця коней?
6. У Чырвонай арміі гэтыя жывёлы займаліся размініраваннем, пошукам параненых і перавозкай медыкаментаў, сакрэтных данясенняў. Усяго ў войскі было мабілізавана 60 тыс. гэтых памочнікаў. Пра якія жывёлы ідзе гаворка?
7. За што легендарны сабака Джульбарс атрымаў вялікую ўдзячнасць ад нашых байцоў?
8. Якія жыхары пустынь і стэпаў дапамаглі савецкім войскам пад Сталінградам?
9. Гэты сабака-дыверсант удзельнічаў у «рэйкавай вайне» ў Беларусі, дзе ўвосень 1943 года паспяхова падарваў гітлераўскі эшалон з 10 вагонаў, апрача таго, са строю быў выведзены вялікі кавалак перагону Полацак – Дрыса. Як звалі сабаку, і якой ён быў пароды?
10. Якім баявым жывёлам прысвечаны помнік у Валгаградзе?

Джульбарс



**Адказы:** 1. Каты; 2. У горадзе развялося шмат грызуноў, а сваіх катоў не засталося. Яны асабліва былі патрэбны для абароны бясцэнных сховішчаў Эрмітажа і іншых палацаў і музеяў; 3. Ласёў; 4. Сакрэтныя данясенні, дастаўленыя галубінай поштай, якая дзейнічала ў гады вайны ў якасці аднаго са сродкаў сувязі; 5. Яны цягнулі зброю, вазы з розным грузам. Бясшумна і неўзаметку праходзілі там, дзе не магла праехаць тэхніка; 6. Пра сабак; 7. Ён знайшоў каля 7500 мін і схаваных снарадаў, чым выратаваў мноства чалавечых жыццяў; 8. Вярблюды. Яны вазілі гарматы, палявую кухню, прадукты харчавання і іншыя клункі; 9. Аўчарка Дзіна; 10. Сабакам-падрыўнікам.